УДК 398.3+233-534(476.2)

# АБРОЧНЫЯ КРЫЖЫ Ў АГРАГАРАДКУ ТОНЕЖ: ЗАХАВАНАСЦЬ І ЗМЕННАСЦЬ ТРАДЫЦЫІ

***В. А. Лабачэўская,*** *доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле абагулены назіранні аўтара за існаваннем аброчнай традыцыі ў аг. Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельской вобласці на працягу апошніх 20 гадоў. Яна выяўляецца ва ўстойлівасці рытуалу абракання як жаночай практыкі. На вялікія гадавыя святы, асабліва напярэдадні Вялікадня, а таксама з аказіянальнай нагоды жанчыны прыносяць на два вясковыя крыжы свае тэкстыльныя ахвяраванні – аброкі. Праведзены аналіз матэрыялаў візуальнай фіксацыі аброчных антрапаморфных крыжоў. Антропаморфнасць мэтанакіравана дасягаецца сродкамі тэкстыльнай пластыкі і спосабамі размяшчэння тканін на крыжы.

**Ключавыя словы**: рытуал, аброк, практыка абракання, аброчны крыж, антропаморфнасць, аг. Тонеж, Лельчыцкі раён.

# SACRIFICIAL CROSSES IN THE AGROTOWN OF TONEZH: PRESERVATION AND CHANGES OF TRADITION

***O. Lobachevskaya,*** *Doctor of Art History, Associate Professor, Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article summarizes the author’s observations during the last 20 years of the existence of the wedding ceremony tradition in the agrotown of Tonezh, Lelchytsy district, Gomel region. It manifests itself in the preservation of the rite of betrothal as a female practice. On major annual feasts, especially on the eve of Easter, also on some occasions, women bring their textile offerings – pieces – to two village crosses. The article analyzes the materials of visual fixation of anthropomorphic crosses. Anthropomorphism is purposefully achieved through textile plasticity and ways of placing fabrics on the cross.

**Keywords:** ritual, sacrificial practice, sacrificial cross, anthropomorphism, Tonezh agro town of Lelchytsy district.

Жаночую практыку абракання – ахвяравання на прыдарожны крыж тканін, якія служаць медыятарам у камунікацыі з сакральным адрасатам, – трэба лічыць адным з грунтоўных складнікаў традыцыйнай культуры беларусаў.

Трывала захоўваецца аброчная традыцыя ў аг. Тонеж Лельчыцкага раёна, дзе ў пачатку і напрыканцы цэнтральнай вул. Юрыя Гагарына на перакрыжаваннях можна бачыць два аброчныя драўляныя крыжы выразнага антрапаморфнага выгляду. У вясковай прасторы яны суіснуюць з адноўленай Мікольскай царквой і помнікам-мемарыялам 262 жыхарам вёскі, якія ў студзені 1943 г. загінулі ад рук гітлераўскіх захопнікаў. Да вайны ў вёсцы жыло больш за 1300 чалавек. Насельніцтва спаленай вёскі аднавілася толькі напалову, а сёння тут пражывае каля 350 чалавек. Жыхары вёскі захавалі шмат адметных традыцый, якія склаліся ў даўніну, калі шматлюдная вёска сярод балот жыла ў сваім замкнёным свеце і лічылася, што менавіта тут і ёсць «край свету». Унікальнай праявай мясцовай культуры з'яўляецца веснавы абрад «Чырачка», які прызнаны дзяржаўнай нематэрыяльнай каштоўнасцю Беларусі.

На працягу 20 гадоў аўтар артыкула назірае за існаваннем унікальнай аброчнай традыцыі ў Тонежы. У мясцовых жанчын прынята штогод абракацца на Вялікдзень. Візуальна традыцыя ўвасоблена ў сталай прысутнасці ў вясковым ландшафце крыжоў, цалкам афармленых аброчнымі тканінамі. У 2004 г. намі быў зафіксаваны крыж на раздарожжы, якое мясцовыя людзі вызначаюць як «паварот на выган» ці «Тарвалаўка». Ідучы па вясковай вуліцы, здалёк можна прыняць крыж за жанчыну, якая стаіць на абочыне дарогі. Высокі драўляны крыж цалкам пакрыты аброчнымі тканінамі. Яны размешчаны такім чынам, што ствараюць падабенства жаночай фігуры: на «таліі» падпяразаны фартух з фабрычнай хусткі, на «галаве» павязаны адна на адной некалькі хустак, аб'ём грудзей і сцёгнаў створаны шматслойнасцю тканін, якія спускаюцца дадолу і нагадваюць доўгую спадніцу. На перакладзіне крыжа, нібы крылы ці рукавы вопраткі, вісяць ручнікі. У парадку размяшчэння тканін чытаецца асэнсаваная мастацкая мэтанакіраванасць. Пластыка ўбранага ў тканіны крыжа адпавядае традыцыйнаму жаночаму строю і прапорцыям фігуры чалавека. Пэўная логіка праглядаецца ў колеравай арганізацыі тканін. Рознакаляровыя тканіны размешчаны ў ніжняй частцы фігуры і нагадваюць яскравую спадніцу, а белыя ручнікі на перакладзіне – белую жаночую кашулю. Невыпадкова мясцовыя людзі яго называюць «крыж-жанчына» і кажуць: «Уродзе галава – на галаву заматываюць хусты. Аброк на весь рок, калі не пачэпіш, то грэх. На Усеношную паснімаюць, спаляць і пачэпляюць – недадзержывае хрэст»[1].

[1] Запісана ад Кацярыны Акуліч 1930 г. н. у аг. Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў 2004 г. Архіў В. Лабачэўскай.

Наступная фіксацыя крыжа праз два гады засведчыла, што яго «вопратка» стала больш рознакаляровай. Сярод тканін заўважаліся ружовыя махровыя ўціральнікі з буйнымі кветкамі кітайскай вытворчасці, шарсцяныя хусткі яркага колеру – «тараноўкі», якія калісьці вельмі цанілася вясковымі жанчынамі. Калі ў 2004 г. на крыжы пераважалі белыя, хатняга вырабу ручнікі і белы паркаль і хусткі з набіўным малюнкам, у 2006 г. кідаліся ў вочы набытыя тканіны і прадметы адзення – хусткі і фартухі, якія ўжо страцілі актуальнасць у гардэробе вясковых жанчын. У 2009 г. выгляд крыжа таксама заставаўся падкрэслена антрапаморфным, яго «адзенне» адрознівалася бадай іншым спалучэннем колераў аброчных тканін (мал. 1).



*Мал. 1.* Аброчны крыж (2009 г., аг. Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці) (фота В. Лабачэўскай)

Напрыканцы 2022 г. два крыжы ў Тонежы сфатаграфавала Алена Паўлоўская. На здымках нельга не заўважыць, што аброчных тканін на крыжах стала менш, што можна патлумачыць адыходам з жыцця старэйшага пакалення жанчын – адэптаў аброчнай традыцыі. На крыжах запанавалі кавалкі пакупных тканін і ручнікоў з набіўным

малюнкам, каляровыя жаночыя хусткі, сярод якіх прысутнічалі адзінкі ручнікоў з вышыўкай. Прытым у форме і выглядзе крыжоў відавочна прасочваецца імкненне надаць ім падабенства з жаночай фігурай: пластычная творчасць выяўляе галаву ў хустцы, завязанай ззаду, вопратку кшталту сукенкі, якая абазначана праз адмысловае размяшчэнне новага ручніка з набіўнымі чырвонымі пеўнямі.

Варта адзначыць, што на крыжах з'явіліся іконы. На адным з іх можна налічыць тры іконы – адна замест галавы, на сярэдзіне крыжа і ўнізе. Такія друкаваныя іконы ў простых драўляных рамках-кіётах, аздобленыя папяровымі кветкамі і фольгай, былі распаўсюджаны ў вёсках у XX ст. Іх з'яўленне на аброчных крыжах сведчыць аб сакральнай утылізацыі рэлігійных атрыбутаў. Іконы паходзяць са старых, кінутых хат, якія з цягам часу руінуюцца. Прыносяць іконы на крыжы таксама спадчыннікі вясковай маёмасці, для якіх яны не ўяўляюць каштоўнасці.

Візуальная дакументацыя тонежскіх крыжоў служыць сведчаннем жыцця аброчнай традыцыі, яе развіцця і набыцця новага сімвалічнага сэнсу. Пры параўнанні здымкаў крыжа на раздарожжы «паварот на выган», якія былі зроблены 28 лістапада 2022 г. і пры наведванні намі Тонежа 25 лютага 2023 г., высветлілася, што за гэты прамежак часу на ім з'явіліся новыя аброкі – блакітная з ружовымі кветкамі хустка-«тарноўка», павязаная нібы фартух; ружовы махровы ўціральнік, які перакінуты праз завязку на поясы; кавалак крамнай матэрыі даўжынёй прыкладна 1 м, завязаны на правам крысе перакладзіны крыжа (мал. 2). Тры новыя ахвяраванні на крыж сведчыць пра трыванне практыкі індывідуальнага абракання на гэты сакральны аб'ект. Магчыма аброкі былі зроблены на Шчадрэц, які на Палессі ўважаюць за пачатак Новага года і які згадваецца ў Тонежы як адно са святаў, калі прынята абракацца. Новыя тканіны-аброкі перакрылі белы ручнік з друкаванымі чырвонымі пеўнямі расійскага ўзору.

Назіранні за існаваннем традыцыі і яе візуальная дакументацыя выявілі зусім новую тэндэнцыю ў абраканні. На другім з тонежскіх крыжоў, які знаходзіцца на супрацьлеглым канцы вёскі каля могілак, паверх напластаванняў аброчных тканін – вышываных і друкаваных ручнікоў, хустак і адрэзаў крамнай матэрыі – былі засведчаны нядаўна павязаныя стужкі чырвонага і зялёнага колеру (мал. 3). Па дзве стужкі розных колераў былі перакрыжаваны на «грудзях» і вольна спушчаны дадолу. Спосаб крыжавання не ўяўляецца выпадковым, ён, напрыклад, прасочваецца як устойлівы прыём у культуры каменных крыжоў. Такі самы касы крыж выбіты па сярэдзіне каменных крыжоў, якія шануюцца ў Лельчыцкім раёне. Менавіта так завязваюць жанчыны аброчныя тканіны і стужкі на могілкавыя каменныя крыжы на Убарацкім Палессі. Двума ручнікамі прынята крыжаваць сватоў на вяселлі [1, с. 109].



*Мал. 2.* Аброчны крыж (2023 г., аг. Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці) (фота В. Лабачэўскай)



*Мал. 3.* Аброчны крыж (2022 г., аг. Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці) (фота А. Паўлоўскай)

Асаблівай увагі ў кантэксце трансфармацыі аброчнай традыцыі заслугоўвае відавочна невыпадковы выбар колеру аброчных стужак – чырвона-зялёнага спалучэння ў адпаведнасці з беларускай дзяржаўнай сімволікай. Інтэнцыю такога выбару можна інтэрпрэтаваць як імкненне актора рытуалу дасягнуць з дапамогай аброку ладу і спакою для ўсіх людзей у Беларусі. Відавочна пераакцэнтуацыя традыцыйнага ахвяравання з забеспячэння патрэбы асобы, сям'і на ўсё грамадства, дзяржаву, краіну Беларусь, што дазваляе казаць пра змены ў інтэнцыянальнасці і семантыцы аброку. Да прычын абракання, якія традыцыйна былі скіраваныя на забеспячэнне экзістэнцыі вяскоўца, сёння дадаецца клопат асобнага чалавека пра будучыню сваёй краіны. Такім чынам, можна канстатаваць, што ў наш час традыцыя абракання пашыраецца і трансфармуецца, набывае новы сацыяльны змест.

1. *Раманюк, М.* Беларускія народныя крыжы / М. Раманюк. – Вільня, 2000. – 222 с.